✓З **4 лістапада** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе выстава **«"Боская камедыя" Дантэ»**, прымеркаваная да 700-годдзя сусветнага шэдэўра Дантэ Аліг'еры.

Увага нададзеная рарытэтным ілюстраваным выданням паэмы з фондаў бібліятэкі. Сярод экспанатаў – факсімільнае выданне, якое дакладна ўзнаўляе першы рукапісны спіс паэмы, аздоблены каляровымі мініяцюрамі (1330 г.).

Таксама прадстаўлены арыгінал аднаго з першых і найлепшых за ўсю гісторыю ілюстраваных выданняў твора, якое пабачыла свет у Фларэнцыі ў 1481 г. Гравюры да яго выкананыя паводле працаў італьянскага мастака эпохі Адраджэння Сандра Баціч элі.

Тут можна пабачыць шэдэўр кніжнай графікі XIX ст. – цыкл гравюраў знакамітага французскага майстра Гюстава Дарэ да першай часткі паэмы «Пекла»

(1861 г.), а таксама іншыя прыклады мастацкага асэнсавання дантаўскай энцыклапедыі навуковых, палітычных, маральна-філасофскіх і багаслоўскіх ведаў эпохі ранняга Адраджэння.

Выстава працуе па 16 студзеня 2022 г.